# МАСТАЦКАЯ АДМЕТНАСЦЬ П’ЕСЫ “СТАРАЖЫТНЫ ПЕРЫЯД, АБО ГІСТОРЫЯ І КАХАННЕ” ЯГОРА КОНЕВА

**Пацапей Н. Р.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дац. *Тарасава С. М.*

Як і ўся сучасная беларуская літаратура драматургія на мяжы XX – пачатку XXI ст. дэманструе нязменны мастацкі пошук і развіццё. Даследчык С. Ганчарова-Грабоўская характарызуе гэты этап наступным чынам: *«В конце XX – начале XXI в. произошли серьезные изменения в поэтике драмы, определив стратегию художественных форм и художественное сознание, что дает право выделить его в отдельный период драматургического процесса»* [1, с. 3].

Кола аўтараў, што працуюць у рэчышчы драматургіі, выключна шырокае. Тут адметна праявілі сябе П. Васючэнка, С. Кавалёў, З. Дудзюк і іншыя сталыя аўтары. Іх творы факусуюцца на новай сацыяльнай рэчаіснасці, у іх пераплятаюцца мінулае і сучаснае, сучаснае і будучае, рашаюцца глабальныя для чытача і гледача пытанні. Па азначэнні П. Васючэнкі, “*у паказе чалавечых перажыванняў, найтанчэйшых душэўных рухаў, перыпетый барацьбы героя з неспрыяльнымі абставінамі з драматургіяй наўрад ці могуць спаборнічаць іншыя жанры літаратуры і віды творчасці ... Феномен драматургіі – стварэнне тэатральнай ілюзіі, падчас такой выразнай і пераканаўчай, што яна можа падацца больш рэальнай, чым само жыццё”* [2, с. 7].

Сярод пісьменнікаў, якім пакарыліся законы драматургіі, варта згадаць імя Ягора Конева, беларускага драматурга, публіцыста, празаіка. Творчасць яго выключна разнастайная. Ягору Коневу належаць каля дзясятка кніг, у ліку якіх гістарычныя аповесці, творы для дзяцей, п’есы. Як пісьменніку, яму ўласцівыя бесперапынныя пошукі новых шляхоў, форм, спосабаў прыцягнення ўвагі да беларускага прыгожага пісьменства як да актуальнага фенομена сучаснай сусветнай культурнай прасторы.

Адна з першых п’ес пісьменніка – камедыя “Старажытны перыяд або Гісторыя кахання”, упершыню з’явілася ў часопісе “Маладосць” за 2006 год. Даследчыкам сучаснай драматургіі А. Трафісчыкам яна адносіцца да твораў, адрасаваных юнай аўдыторыі: *“Камедыю характараў “Старажытны перыяд або Гісторыя кахання” можна маркіраваць маладзёжнай п’есай”* [3, с. 47]. Паводле прапанаванай даследчыкам класіфікацыі твораў для дзяцей і юнацтва, Я. Конеў прадставіў свой узор рэалістычнай драматургіі для юных чытачоў.

П'еса закранае адвечную для літаратуры тэму – месца кахання ў жыцці чалавека. І хаця падаецца, што аўтар спрабуе выказаць дастаткова пашыраную думку пра тое, што ўсё ў гэтым свеце залежыць ад кахання і завязана на ім, форма падачы матэрыялу вылучаецца сваёй навізной і неардынарнасцю.



Репозиторий ГрГМУ

Кампазіцыя твора мае адметную будову, бо ў п'есе падаецца некалькі сюжэтных ліній, цесна звязаных паміж сабой. Сама ж п'еса напісана ў жанры камедыі ў дваццаці сямі дзеяннях. Конеў арыгінальна звязвае падзеі мінулай гісторыі Беларусі з сучаснасцю.

У п’есе разгортваецца міжасабовы канфлікт, які ўзнік паміж выкладчыкам Яромкіным і студэнткай Аленай, якая не здала заліку з-за яе пропускаў заняткаў. Дзяўчына просіць свайго сябра Рамана аб дапамозе. Гэты малады чалавек, добры і велікадушны, гатовы прыйсці на дапамогу ў любы момант, бо відавочна перажывае высокія пачуцці да Алены. Ён коратка расказвае ёй увесь курс старажытнай гісторыі ад Рагнеды да Вітаўта. Прыйшоўшы на іспыт, дзяўчына падае выкладчыку сваё арыгінальнае бачанне старажытнай гісторыі, якая, на яе думку, неад’емна злучана з каханнем. Па меркаванні дзяўчыны, усе рашэнні, якія прымаюцца людзьмі ў адказныя моманты, грунтуюцца на пачуцці кахання. Хаця пры адказе Алена яўна блытае падзеі і дзейных асоб пэўных гістарычных перыядаў.

Як і ўся п'еса, развязка мае камедыйны характар. Выкладчык Яромкін быў незадаволены падрыхтоўкай Алены, але ўменне студэнткі падхваліць яго прафесійныя здольнасці зрабіла сваю справу. І выкладчык мусіў прызнаць, што зрухі ў ведах Алены ўсё ж ёсць. У выніку дзяўчына атрымала добрую адзнаку. Закаханы Раман рады, што змог дапамагчы Алене. Ён хоча атрымаць доўгачаканы пацалунак, але Алена адмаўляе яму, бо яе больш цікавяць такія гістарычныя дзеячы, як Ян Сабескі, Аўгуст Моцны і Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Алена і яму спрабуе даказаць сваю думку пра беларускую гісторыю, у якой аказалася столькі цікавых падзей, завязаных на каханні.

Як бачыцца, у творы ўсяго тры персанажы. Аднак аўтару ўдаецца займальна выбудаваць сюжэт, дзякуючы прыёму пераапранання: яго дзеючыя героі ў патрэбны момант пераўвасабляюцца ў гістарычных персанажаў, з якімі звязана тая ці іншая любоўная гістрыя.

Такім чынам, п'есу Я. Конева “Старажытны перыяд, або Гісторыя і каханне” можна разглядаць як красамоўны ўзор моладзевай рэалістычнай драматургіі. Аўтар выявіў у творы адметныя і пазнавальныя сучасніку праявы рэчаіснасці, перадаў багатую гаму пачуццяў, што перажываюць яго героі. Менавіта прапісаныя Я. Коневым персанажы з іх характарамі, учынкамі і выбарам ажыўляюць дзеянне п'есы. Гэта дае падставы канстатаваць: сярод прадстаўнікоў драматургічнага напрамку, пісьменнік вылучаецца сваім высокім мастацка-эстэтычным патэнцыялам, а яго творы сведчаць пра плён спалучэння лепшых традыцыйных рыс беларускай драмы з актуальнай тэматыкай і сучаснымі сцэнічным эфектамі.

Літаратура:

1. Ганчарова-Грабоўская, С. Современная русская драматургия (к. XX – н. XXI в.): уч. пособие / С. Гончарова-Грабовская. – Мн. : Вышэйшая школа, 2021 – 271 с.

2. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія: Дапаможнік для настаўнікаў / П. Васючэнка. – Мн.: Мастацкая літ., 2000. – 158 с.



Репозиторий ГрГМУ

3. Трафімчык, А. Сучасная беларуская рэалістычная драматургія для дзяцей і моладзі / А. Трафімчык // Адлюстраванне сучаснай Беларусі ў мастацкай літаратуры: зборнік навуковых артыкулаў. – Мн.: Беларуская навука, 2020. – С. 39–51.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ У МЕДЫЦЫНЕ

**Рамэйка Т. І.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – *Сняжыцкая А. С.*

Быць цікаўным – адна з самых галоўных рыс чалавека з самых даўніх часоў. Трапнай, ёмкай і зразумелай характарыстыкай самых розных працэсаў, здарэнняў, характараў, знешнасцей і шматлікіх іншых рэчаў сталі фразеалагізмы. Людзі заўсёды падмячалі пры дапамозе фразіялагізмаў фізічны і псіхічны стан чалавека. Шмат з такіх выказванняў не ўстарэлі і сёння. Студэнтам-медыкам знаёмства з такімі фразеалагізмамі дапамагае лепш засвоіць прафесійную лексіку беларускай мовы. Пры некаторай карэкцыі іх могуць выкарыстоўваць урачы ў сваёй прафесійнай дзейнасці з мэтай наладжвання камунікацыі з пацыентамі. Прывядзем прыклад такіх трапных выказванняў.

*Фразеалагізмы пра смерць*: трапіць да Абрама на піва; ногі працягнуць; аддаваць Богу душу; адкідваць канькі (капыты); адправіцца на той свет; адысці з гэтага свету; адысці ў вечнасць (лепшы свет, у вырай); ажаніцца з сырой зямлёй; выпростваць ногі; дух выпусціць; аддаваць канцы; даваць дуба; дух вон; Бог прыбраў; знайсці сабе магілу; спаць у сырой зямлі.

*Фразеалагізмы пра агонію*: адной нагой стаяць у магіле; глядзець смерці ў вочы (твар); дні злічаны; дыхаць на ладан; зямлёй пахнуць; не жылец (на гэтым (белым) свеце); паміж жыццем і смерцю; на Божай пасцелі; жывы нябожчык; на божай (смяротнай) пасцелі; зямлёй пахнуць; песенька спета; на паповы сані збірацца; складваць рукі; жывы труп.

*Фразеалагізмы пра слабасць*: хістацца ад ветру; ад ветру валіцца; выбівацца з сіл; ледзь душа ў целе; як з крыжа зняты; ногі не носяць; ногі не трымаюць; парахня сыплецца; пясок сыплецца; ледзь трымацца на нагах; хоць у дамавіну кладзі; ледзь ногі цягаць ( цягнуць, валачы); ледзь шоры цягаць.

*Фразелагізмы пра гіперактыўнасць*: адарві ды падай.

*Фразеалагізмы пра блізнят*: на адзін твар; як дзве кроплі вады.

*Фразеалагізмы пра анарэксію*: адна скура ды косці; адны вочы засталіся; барабаніць касцьмі; жывот да спіны (да хрыбетніка, да паясніцы) прырос (прысох,прыліп); з’ехаць на мыла; скура ды арматура.

*Фразеалагізмы пра бяссонне*: ні ў адным воку.

*Фразеалагізмы пра алкагольны дэлірый*: адпіць мазгі; пабачыць шкляного Бога.



Репозиторий ГрГМУ